балясіне і шырокага круглага паддона. Свяшчэнныя выявы, надпісы, тэхніка выканання і арнаменты паціраў цесна звязаныя з іх літургічным прызначэннем.

На беларускіх пацірах, у адрозненне ад рускіх, заўважаюцца пэўныя рысы мясцовага стылю. Беларускія вырабы гарманічныя па прапорцыях, чаша нярэдка завужаная да нізу. Пацiры маюць гатычныя элементы ў формах, накладных і ажурных крыжаватых, крыжападобных матывах, у характэрных квадратных выступах несапраўдных аправаў на «яблыку» [3, с. 126].

Тагачасныя творы хрысціянскага культу працягвалі пераважна візантыйскія традыцыі вырабу каштоўных свяшчэнных рэчаў і ўяўлялі сабой гладкую паўсферычную чашу з абавязковым літургічным надпісам на вянцы, злучаную стаянам з устойлівай асновай-паддонам.

У афармленні пацiраў з Беларусі шырокае распаўсюджанне набыла тэхніка чаканкі, на характар якой уплываў пануючы стыль мастацтва. Уласцівыя готыцы рысы і элементы добра прасочваюцца ў пацірах канца XV–XVI стст. з Ружанаў (НММ) і Навагрудка (НГМ), якія тыпалагічна бяруць пачатак з твораў Германіі і Польшчы. На стылістыку беларускіх ювелірных вырабаў аказвала моцны ўплыў і мясцовае культурнае асяроддзе.

Матэрыялы археалагічных раскопак, архіўныя і друкаваныя крыніцы сведчаць, што ў беларускіх гарадах у XII–XVI стст. сярод разнастайных мастацкіх рамёстваў ювелірная справа займала вядучае месца. Нават такі досыць агульны агляд асартыменту прадметаў рэлігійнага культу дазваляе меркаваць пра мастацкую выразнасць, самабытнасць формаў і арнаментацыі ювелірных вырабаў. Узоры мастацкай апрацоўкі металаў дэманструюць гістарычную і семантычную пераемнасць ад язычніцкіх абярэгаў да хрысціянскіх каштоўнасцей. У некаторых вырабах ювелірнага мастацтва адчувальныя ўплывы готыкі, з канца XVI ст. – Рэнесансу.

Бурныя падзеі XVI ст. сталі пераломным этапам у гісторыі беларускага мастацтва. Далейшае яго развіццё адбываецца, галоўным чынам, у межах стылю барока, але з захаваннем вялікай ролі традыцый папярэдняга перыяду.

**Спіс літаратуры:**


1. Алексеев, Л.В. Мелкое художественное литье из некоторых западнорусских земель: кресты и иконки Белоруссии / Л.В. Алексеев // Совет. археология. – 1974. – № 3. – С. 204–219.
2. Археалогія Беларусі : у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі ; [навук. рэд. П.Ф. Лысенка]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2001. – Т. 3 : Сярэдневяковы перыяд (IX–XIII стст.) / [Я.Г. Звяруга і інш. ; рэдкал.: В.С. Вяргей і інш.]. – 2000. – 554 с.
3. Беларусы : [у 12 т.] / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2009. – Т. 8 : Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва / [Я.М. Сахута]. – 2005. – 351 с.
4. Гісторыя беларускай кнігі : у 2 т. / пад агул. рэд. М.В. Нікалаева ; рэдкал.: Т.У. Бялова. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2009. – Т. 1 : Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М.В. Нікалаеў ; навук. рэд.: В.В. Антонаў, А.І. Мальдзіс. – 424 с.
5. Друцк : Друцк и Друцкая волость (княжество) в IX-XII вв., летопись древних слоев, князья Друцкие и их владения в XIII-XVIII вв., ремесло, промыслы, торговля (по данным археологии, нумизматики, письменных источников), памятники архитектуры и объекты туризма / О.Н. Левко [и др.]; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко ; Нац. академия наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 619 с.
6. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII–XVIII стст. : альбом / [аўт.-склад. Н.Ф. Высоцкая]. – Мінск : Беларусь, 1984. – 232 с.
7. Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны = Животворный символ Отчизны : гісторыя Крыжа святой Еўфрасінні Полацкай / [аўт.-уклад. У. Арлоў ; навук. рэд. Г. Штыхаў]. – Мінск : Асар, 1998. – 326 с.
8. Максімава, Э.С. Мастацкія якасці шатаў абразоў XVI – першай паловы XVII ст. / Э.С. Максімава // Помнікі мастацкай культуры Беларусі эпохі Адраджэння / Н.Ф. Высоцкая [і інш.] ; пад рэд. С.В. Марцэлева. – Мінск, 1994. – С. 143–150.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Алена Емялёва*

## ВЫТОКІ І ПЕРШАПАЧАТКОВЫЯ ФОРМЫ МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВІЦЕБШЧЫНЫ: ФАЛЬКЛОР І НАРОДНАЯ МУЗЫКА

Музычная культура Віцебска на працягу стагоддзяў адлюстроўвала і ўвасабляла шматлікія і разнастайныя з'явы і тэндэнцыі. Спачатку гэта былі тэндэнцыі Сярэднявечча, што вызначылі аблічча музычнага мастацтва і культуры X-XV стст., потым былі эпахальныя гісторыка-стылявыя з’явы і тэндэнцыі, якія прынята аб’ядноўваць універсальнымі для еўрапейскай культуры паняццямі Рэнесанса, Барока, Класіцызму і Рамантызму.

Культура старажытных беларускіх зямель мела шмат агульнага з культурай іншых усходнеславянскіх народаў. Але пры ўсёй агульнасці яна мела сваю спецыфіку, якая найбольш яскрава выявілася ў матэрыяльнай і духоўнай культуры Полацкага княства, у склад якога уваходзіў і Віцебск. У IX-XIII стст. там квітнела высокая

раннефеадальная культура, развівалася пісьменства, вялося летапісанне, шырока распаўсюджваліся рамёствы. Княства значна ўплывала на гаспадарчае і культурнае развіццё суседніх народаў.

Найвышэйшым узорам старажытнаславянскай культуры ў той час з'яўлялася манументальная архітэктура, у якой дамінаваў раманскі стыль. З прыняццем хрысціянства пачалося ўзвядзенне манументальных культавых пабудоў. У XII ст. у Віцебску у гэтым стылі была пабудавана Благавешчанская царква, у XI ст. - Сафійскі сабор у Полацку. Высокага ўзроўню дасягнуў і фрэскавы жывапіс, які ўвабраў багатыя народныя традыцыі і лепшыя здабыткі візантыйскіх мастацкіх школ.

Мастацкая культура старажытных віцебскіх зямель бярэ свой пачатак ад вуснай народнай творчасці – песень, былін, легенд, прымавак, казак, плачаў, галашэнняў і загадак. Культура Полацкай зямлі мела сваю спецыфіку і стаяла ў шэрагу перадавых культур свайго часу. Арыгінальнае спалучэнне мясцовай візантыйскай і раманскай стылістык з'яўлялася адной з характэрных асаблівасцей культуры старажытных віцебска-полацкіх зямель.

Адметнай рысай насельніцтва старажытных віцебскіх зямель было яго вялікае захапленне музыкай, песнямі, карагоднымі танцамі, якімі суправаджаліся самыя розныя праявы сямейнага, культавага і вытворчага жыцця людзей. З выступленнем спевакоў, музыкантаў, танцораў насельніцтва было добра знаёмае праз мастацтва вандроўных скамарохаў – першых на славянскіх землях музыкантаў і акцёраў, мастацтва якіх яднала розныя элементы творчай дзейнасці – ад пантамімы да ігры на музычных інструметнах. Менавіта творчасць скамарохаў можна разглядаць у якасці адной з першапачатковых форм паратэатральнага мастацтва. Скамарохі самі складалі музычна-драматычныя сцэнкі, якія пераходзілі ў сялянскае і гарадское асяроддзе. Асабліва доўга захоўвалася скамарошаства на віцебска-полацкіх землях.

Першыя ўспаміны пра скамарохаў датуюцца 1068 г. Структура тагачасных скамарошных прадстаўленняў у'яўляла сабою яскравае тэатралізаванае дзеянне, якое спалучала драматычную ігру, пантаміму, танцы, цыркавыя нумары, інструментальнае суправаджэнне. Некаторыя даследчыкі бачылі ў іх перадумовы драматычнага мастацтва з-за ўжывання дыялагічных нумароў. Прафесія скамароха прадугледжвала абавязковае ўменне іграць на розных музычных інструментах-гуслях, трубах, сапілках, сурнах, домрах, валынках, жалейках, гудках, лірах, свірэлях, бубнах. Функцыя музыкі ў скамарошных дзеяннях была вельмі важная, бо яна не толькі стварала святочную атмасферу самога дзеяння, але спрабавала адлюстраваць выступленні персанажаў, перадаць характар іх дзеяння і адпавядаць кантэксту сваім гучаннем. Менавіта наігрышы інструменталіста-скамароха сталі папярэднікамі акампаніруючай і выразнай функцыі суправаджэння, якое пазней будзе прысутнічаць у творах прафесійнага музычнага мастацтва Віцебшчыны.

Звесткі пра інструментарый скамарохаў, іх песенна-танцавальную творчасць дазваляюць убачыць поліфункцыянальную скіраванасць музычнага кампанента ў гульнёвай дзеі. Па-першае, музыка выконвала экспрэсіўна-выразную функцыю, бо стварала неабходны эмацыянальны фон, атмасферу, узмацняла мастацкае ўражанне ад таго, што адбывалася. Па-другое, музычнае суправаджэнне ў вызначанай меры адлюстроўвала характары дзеючых асоб. Па-трэцяе, выкарыстанне музыкі на працягу ўсёй дзеі надавала ёй рысы цэласнасці і арганізаванасці. Інструментальнае суправаджэнне закладала асновы кампазіцыйна-арганізуючай функцыі музыкі, якая ў больш позні час арганічна увойдзе ў тэатральна- музычныя формы. Па-чацвёртае, уключэнне ў дзею разнастайных жанравых нумароў – танцаў, песень, інструментальных наігрышаў і імправізацый, песенна-рэчытатыўных дыялогаў – сведчыла пра багаты самабытны патэнцыял для прафесійнай музычнай творчасці.

На раннім этапе свайго фарміравання і развіцця ўсе магчымыя абрадавыя рытуалы, карагодныя дзеянні, гульні, у якіх мелiся элементы прымітыўных форм музычна-тэатральных прадстаўленняў, былі сінтэтычнымі па сваёй сутнасці. Часта ў іх усе віды мастацтва зліваліся ў адзіны паток, каб узбагаціць і ўзмацніць абрадавасць, унесці ў яе музычна-тэатральныя элементы.

У перыяд фарміравання прасцейшых форм музычнага тэатра на Віцебшчыне яны былі цесна звязаны з працай, неслі ў сабе элементы сакральных замоў. Абрадавае мастацтва, хоць і не ставіла галоўнай праблему стварэння мастацкага вобраза, але садзейнічала крышталізацыі прасцейшых форм музычнага прафесійнага тэатра. У гэтыя народныя дзеянні, карагоды, гульні рознымі шляхамі ўваходзіла мастацтва скамарохаў, якія песнямі, жартамі, ігрою на музычных інструментах уносілі элемент музычна-тэатральнай выразнасці. Музыка і песні ў прадстаўленнях з'яўляліся неабходнымі кампанентамі і ўзбагачалі тэатралізаваныя сцэнкі. Музыка значна ўзмацняла агульнае ўражанне і рабіла дзеі больш цікавымі і вясёлымі.

Такім чынам, відавочна, што прафесійны музычны тэатр Віцебшчыны засноўваўся на магутнай фальклорнай глебе, абрадавым рытуале. Росквіт опернага і балетнага мастацтва абумоўлены апорай на спрадвечныя песенныя, інструментальныя, музычна- харэаграфічныя традыцыі. Менавіта засваеннем нацыянальнай музычнай традыцыі вызначаецца складаны працэс станаўлення нацыянальнага музычнага тэатра, прафесійнай музычнай культуры не толькі на Віцебшчыне, але і наогул на Беларусі.

Кожная са славянскіх традыцыйных культур мае выразныя рысы самабытнасці. Абрадавая культура з'яўляецца першавытокам музычнага, паэтычнага, тэатральнага і выяўленчага мастацтваў. Музыка ў абрадавай культуры – адзін са сродкаў увасаблення гульнёвай святочнай стыхіі, што з'яўляецца сутнасным для музычнага тэатра, бо музыка – гэта моцная сіла ўздзеяння. Розныя музычна-тэатральныя формы прадугледжваюць не толькі вызначаны ракурс адлюстравання рэчаіснасці (лірыка-драматычны, лірыка-эпічны, камічны, героіка-эпічны і інш.), але і патрабуюць выкарыстання адпаведных сродкаў стварэння музычна-драматычнага вобразу. Музычны тэатр – адна са старажытных форм тэатра, які вельмі блізка знаходзіцца да народнай культуры,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міфалогіі, абрадавасці, элементы якіх траплялі як ва ўсе раннія формы беларускага тэатра (батлейка, школьны тэатр), так і ў больш познія прафесійныя формы.

Станаўленне ранніх форм музычнай культуры Сярэднявечча было звязана таксама і з рознымі сферамі гарадскога побыту: афіцыйнай і прыватнай, святочнай і штодзённай, рэлігійнай і свецкай. Фарміраванне і развіццё музычнага мастацтва і культуры цесна звязана з ростам і развіццём гарадоў. Найбольш яскравай была сувязь музычнага мастацтва з рэлігійным жыццём, з храмамі – галоўнымі цэнтрамі духоўнага жыцця чалавека таго часу.

Пры Благавешчанскай царкве ў Віцебску гуртаваліся прафесійныя выканаўцы, ствараліся і дзейнічалі школы пеўчых, з якіх найбольш славіліся Полацкая і Віцебская школы.

Да эпохі Сярэднявечча адносяцца і першыя ўзоры беларускай хрысціянскай гімнаграфіі (напрыклад, Віцебскі знаменны распеў), якая развівалася на аснове знаменнага распеву і вылучалася лакальнай спецыфікай – асаблівай строгасцю, узнёсласцю і ўрачыстасцю (“Песнапенні аб Ефрасінні Полацкай”). Да нас дайшлі звесткі і пра некаторыя з’явы музычнага жыцця, што тычыліся свецкага боку гарадскога побыту. Іх данеслі да нас знойдзеныя пры раскопках музычныя інструменты, выявы музыкантаў, старажытныя летапісы часоў Полацкага княства.

Такім чынам, усе формы музычнага жыцця сярэднявечнай Полацка-Віцебскай зямлі складалі цікавы музычна-культурны пласт, які спрыяў далейшаму развіццю прафесійнай музычнай культуры рэгіёна.

**Спіс літаратуры:**

1. Данілевіч, В.Е. Нарыс гісторыі Полацкай зямлі да канца XVI ст. / В.Е. Данілевіч. – Кіеў, 1896. – 260 с.
2. Доўнар-Запольскі, М. Нарыс гісторыі крывіцкай і дрыговіцкай зямель да канца XII ст / М. Доўнар-Запольскі. – Кіеў, 1891. – 170 с.
3. Нікіфароўскі, М.Я. Старонкі з нядаўняй даўніны г. Віцебска / М.Я. Нікіфароўскі. – Віцебск, 1899. – 136 с.

***Юрый Барадзін***

## КУЛЬТУРА І МАСАВАЯ СВЯДОМАСЦЬ У АКТУАЛЬНЫМ ЧАСЕ

Іспанскі філосаф Артэга-і-Гасэт у кнізе «Паўстанне мас» (1929) падкрэсліваў, што Еўропа ў ХХ ст. перажывае цяжкі крызіс. Адной з прычын крызісу, на яго думку, з’яўляецца «Паўстанне мас» [1]. Гарадскі натоўп кіруецца выключна спажывецкім інтарэсам, заўсёды гатовы быць на баку ўладных структур.

У беларускай культуры сутнасць чалавека масы выдатна адлюстроўвае Янка Купала ў п’есе «Тутэйшыя». У адрозненне ад Артэгі Купала не абмяжоўвае колам гарадскога плябейства. Масавая свядомаць у Купалаўскім творы ўласціва і вышэйшым саслоўем. У асобе героя Мікіты Зноска масавы чалавек хлусіць «тутэйшасцю» і ахвяруе бацькаўшчынай.

У масавай свядомасці паспяхова функцыянуе мноства сімвалаў веры і хлусні. Інтэрсуб’ектыўнасць замяняе ісціну. На грамадскую арэну ўпэўнена выходзіць масавы чалавек, які моцна ўплывае на жыццё людзей і фарміраванне культуры, паступова ствараючы тое, што сёння называецца «масавай культурай».

З працы Смірновай чалавек масы лічыць сябе дасканалым, не прызнае сваіх памылак, ніколі не сумняваецца ў сабе, у сваіх думках, у сваіх учынках, і дзеля таго, каб пацвердзіць сваё меркаванне як «ісціну», набірае прыхільнікаў для сваёй жа карысці і выгады. Поўны клопатаў аб самім сабе, робіць усё, што хоча, не стараючыся сябе змяніць і палепшыць, навязваючы свае агідныя меркаванні, нікога не прызнаючы, акрамя сябе і вышэйшых чыноў, ад якіх ён залежыць. Ён прыхільнік культу сілы, не прызнае тых, хто да яго не падобны, адштурхвае ад сябе тых, з кім нязгодны.

Што датычыцца культуры, Артэга-і-Гасэт піша аб культуры такія мудрыя рэчы: «*Там, дзе няма нормаў, там няма і культуры. Няма культуры там, дзе няма грамадзянскай законнасці. Няма культуры там, дзе ў вырашэнні спрэчак ігнаруюцца асноўныя прынцыпы розуму. Няма культуры там, дзе эканамічныя адносіны не падначалены рэгулюючаму апарату, да якога можна звярнуцца. Няма культуры там, дзе ў эстэтычных дыспутах ўсякае апраўданне для творы мастацтва аб'яўляецца залішнім. Калі ўсе гэтыя нормы, прынцыпы і інстанцыі знікаюць, знікае і сама культура і настае варварства ў дакладным значэнні гэтага слова*».

Марцін Хайдэгер бачыў вытокі ў занядбанні навукай, культурных сэнсаў, перш за ўсё каштоўнаснага сэнсу быцця. Каб зразумець «сэнс быцця», чалавек павінен адмовіцца ад усіх практычна-мэтавых установак, асэнсаваць сваю «тленнасць» і «фактар аднаразавага існавання».

Культура патрабуе ад людзей кіравацца справядлівасцю, сумленнасцю, праўдзівасцю, і многімі іншымі чалавечымі каштоўнасцямі, якія адрозніваюцца ад каштоўнасцей масавага чалавека, які валодае «замкнутасцю душы», эгаізмам і ўсё больш страчвае сувязь з культурай і рэальнасцю, замяняючы яе бескультур’ем.

Важнейшай асаблівасцю ў культуры, мастацтве і фальклоры з’яўляюцца захаванне нацыянальных і мастацкіх традыцый, этнасу і народнай творчасці, гісторыка-культурнай спадчыны і народнай самасвядомасці, якія перадаюцца з пакаўленняў у пакаленні, дзякуючы якім чалавек павінен жыць у згодзе з прыродай, абараняць яе і ахоўваць сваё навакольнае асяроддзе.